УДК 947.6«1944/1955»

Н.К. Юргевіч

# Культурна-асветная работа ў беларускай вёсцы ў сярэдзіне 1940-х – пачатку 1950-х гг.

Вялікая Айчынная вайна нанесла значны ўрон установам культуры і адукацыі Беларусі. За ваенныя гады ворагі знішчылі ў рэспубліцы 8825 (з 12294) школ, усе навукова-даследчыя цэнтры, АН БССР, 219 бібліятэк, 5425 музеяў, тэатраў і клубаў, 2651 дзіцячую ўстанову [1]. Асаблівыя разбурэнні адбыліся ва ўсходніх абласцях БССР. Беларуская вёска пасля вайны фактычна паўставала з руін: у Лельчыцкім раёне з 6 тыс. дамоў калгаснікаў, грамадскіх арганізацый і культурных устаноў засталося толькі 32 будынкі, у Асвейскім – з 3540 – 8, у Суражскім – з 8670 – 577 будынкаў. Такое становішча было ў Расонскім і Акцябрскім раёнах БССР [2]. Таму адразу пасля выгнання нямецка-фашысцкіх захопнікаў вялікая ўвага надавалася аднаўленню разбураных вайной культурна-асветных устаноў і наладжванню іх работы.

Праграма аднаўлення культуры сяла знайшла сваё адлюстраванне ў чацвёртым пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі краіны на 1946–1950 гг. [2, арк. 246–319]. У вобласці культурнага будаўніцтва ў вёсцы патрабавалася вырашыць складаныя задачы: аднавіць і пашырыць сетку аб'ектаў культуры, выпусціць неабходныя для іх працы абсталяванне і інвентар, падрыхтаваць кадры культасветработнікаў, наладзіць культурна-асветную работу. Хаты-чытальні, клубы і бібліятэкі ў вёсцы разглядаліся як важны накірунак ідэалагічнай работы. Сваёй дзейнасцю яны дапамагалі партыі ў рэалізацыі аднаўленчых задач,

садзейнічалі патрыятычнаму выхаванню моладзі, разумнай арганізацыі яе вольнага часу. У 1945 г. з мэтай умацавання кіраўніцтва культурна-асветнай работы пры СНК БССР на правах рэспубліканскага наркамата быў створаны Камітэт па справах культурна-асветных устаноў. Пры абласных і гарадскіх выканкамах дэпутатаў працоўных стваралiся аддзелы, а пры раённых выканкамах зацвярджаўся штат інспектараў па культурна-асветнай рабоце.

У першыя пасляваенныя гады з-за вялізных разбурэнняў і недастатковага фінансавання развіццё культурна-асветнай работы ў сельскай мясцовасці вельмі тармазілася. Як сведчаць архіўныя дакументы, на гэта ўплываў шэраг прычын: адсутнічалі кваліфікаваныя кадры, мала ўвагі ўдзялялася фінансаванню, не хапала будынкаў і памяшканняў і г.д. У лепшым выпадку культустановы знаходзіліся ў сялянскай хаце ці разам з сельсаветам. Да прыкладу, у 1948 г. у Маладзечанскай вобласці з 210 хат-чытален 128 не мелі сваіх памяшканняў, размяшчаліся ў сельсаветах і прыстасаваных сялянскіх хатах [3].

У мэтах шырокага разгортвання палітмасавай работы на сяле і актывізацыі культурнага жыцця калгаснага сялянства, паміж культасветустановамі было арганізавана штогадовае сацыялістычнае спаборніцтва, якое садзейнічала ўладкаванню аб'ектаў культуры, вызваленню для іх уласных памяшканняў, іх рамонту і забеспячэнню палівам. У 1946–1947 гг. Савет Міністраў БССР і ЦК КП(б)Б зацвердзілі палажэнне аб пераходным Чырвоным сцягу і аб устанаўленні грамат і грашовых прэмій для пераможцаў у сацыялістычным спаборніцтве сярод клубных устаноў, бібліятэк і калектываў мастацкай самадзейнасці рэспублікі. Вынікі спаборніцтва павінны былі падводзіцца штоквартальна. Умовамі спаборніцтва прадугледжвалася выдзяляць грашовыя прэміі на індывідуальнае прэміраванне работнікаў (50–60%) і фінансаванне мерапрыемстваў па паляпшэнні культурна-вытворчых умоў для работы клубных устаноў або бібліятэк [3, арк. 492]. Архіўныя дакументы сведчаць, што сацыялістычнае спаборніцтва давала пэўныя вынікі. Нягледзячы на складанасці аднаўленчага перыяду, да сярэдзіны 50-х гадоў сетка культурна-асветных устаноў пераўзышла даваенную. Калі ў 1940 г. у сельскай мясцовасці БССР дзейнічала 3527 клубных устаноў, то ў 1950 г. іх было 4160 [4].

Матэрыяльная база ўстаноў культуры аднаўлялася і развівалася і праз выдаткаванне грошай сельскімі і пасялковымі Саветамі, культфондамі калгасаў і саўгасаў. Праўда, неабходна адзначыць, што ў пасляваеннай дзяржаўнай палітыцы ў адносінах да вясковай культуры дзейнічаў рэшткавы падыход да выдзялення матэрыяльных сродкаў, якія накіроўваліся, галоўным чынам, на развіццё цяжкай і, асабліва, абароннай прамысловасці. На культурнае будаўніцтва і культурна-масавую работу ў сельскай мясцовасці штогод асігноўвалася толькі каля 6–7 млн. рублёў, што, безумоўна, было недастатковым [4, арк. 196]. Колькі прыкладаў: загадчык Віцебскага абласнога аддзела культасветработы ў адной са справаздач адзначыў, што ў 1949 г. на 239 хат-чытален было асігнавана ўсяго 10 тыс. руб. (па сутнасці, іх хапіла на аднаўленне толькі адной хаты-чытальні, хаця ў той час хуткага рамонту патрабавалі 37 хат-чытален) [3, воп. 1, с. 20, арк. 49].

З другога боку, сельсаветы часта затрымлівалі грашовыя сродкі для культустаноў альбо расходавалі іх на іншыя мэты. У 1953 г. шмат якія культустановы Гомельскай вобласці, напрыклад, Забабаўская хата-чытальня Буда-Кашалёўскага раёна і інш., не змаглі набыць літаратуру і перыядычныя выданні па той прычыне, што сельсаветы не выдзелілі грошы, хаця гэтыя сродкі былі запланаваны для выдзялення сесіямі раённых Саветаў народных дэпутатаў [5].

Архіўныя дакументы дазваляюць зрабіць выснову, што пасля Вялікай Айчыннай вайны патрабаванні да культурна-асветнай работы ў сельскай

мясцовасці заставаліся дастаткова высокімі. Быў узяты курс на паступовае пераўтварэнне хат-чытален у сельскія і калгасныя клубы. Праўда, такая рэарганізацыя вялася вельмі маруднымі тэмпамі. Напрыклад, у Магілёўскай вобласці ў 1952 г. па плане калгасы павінны былі пабудаваць 40 клубаў, а здалі ў эксплуатацыю толькі 26 [6]. У гэтых умовах вялікае значэнне меў рух калгаснікаў, рабочых саўгасаў і МТС, сельскай інтэлігенцыі за ўзвядзенне хат-чытален, бібліятэк, клубаў і дамоў культуры метадам народнай будоўлі.

Важнейшай задачай культурнага будаўніцтва ў пасляваеннай вёсцы было забеспячэнне культасветустаноў кадрамі кваліфікаваных работнікаў. Вывучэнне дакументаў паказвае, што шмат якія з іх не працавалі менавіта з-за адсутнасці работнікаў. Да таго ж, у першыя пасляваенныя гады большасць з іх не мела спачатку не толькі спецыяльнай падрыхтоўкі, але і агульнай сярэдняй адукацыі. Напрыклад, са 180 загадчыкаў хат-чытален Брэсцкай вобласці ў 1945 г. толькі 6 чалавек мелі сярэднюю, астатнія незакончаную сярэднюю ці нават пачатковую адукацыю [2, с. 196, арк. 32]. Органамі кіравання прымаліся неабходныя меры па накіраванні здольнай моладзі на вучобу ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя ўстановы культуры і бібліятэчнай справы, у тым ліку ў такія, як Усесаюзны інстытут павышэння кваліфікацыі кіруючых палітасветработнікаў, Маскоўскі і Ленінградскі бібліятэчныя інстытуты, культасветвучылішчы ў гг. Магілёве і Гродне. Аднак – сведчаць дакументы – план набора студэнтаў выконваўся не заўсёды і не ў поўным аб'ёме. Напрыклад, у Віцебскай вобласці як у 1945–1946 гг., так і ў 1946–1947 гг. не быў выкананы план пасылкі моладзі нават на завочнае навучанне: замест 318 чалавек было накіравана на вучобу толькі 118. Нельга не адзначыць і тое, што на эфектыўнасць навучання ўплывалі дрэннае забеспячэнне ўстаноў падручнікамі і метадычнымі дапаможнікамі, цяжкае матэрыяльнае становішча культработнікаў [3, воп. 1, с. 14, арк. 45]. Таму галоўнай масавай формай падрыхтоўкі культработнікаў БССР пасля вайны была курсавая сістэма (галоўным чынам, кароткія семінары).

Як сведчаць дакументы, вельмі вострым пытаннем была выплата заработнай платы загадчыкам культасветустаноў. Сельсаветы і райана часта затрымлівалі яе на 5–11 месяцаў. У 1945 г., напрыклад, Кабішчанская хата-чытальня Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці стала вядомай як пераможца сацыялістычнага спаборніцтва, але яе загадчыца Л.Д. Лапо зарплату не атрымоўвала на працягу некалькіх месяцаў [3, арк. 189]. Непадрыхтаванасць да працы многіх культработнікаў, нізкая заработная плата, адсутнасць картак на хлеб, прамтавары, нездавальняючыя жыллёва-бытавыя ўмовы жыцця – усё гэта выклікала хуткую змену кадраў, адмоўна адбівалася на іх працы. За 1947 г. у Слаўгарадскім раёне Магілёўскай вобласці змяніліся 4 інспектары райаддзела, а ў хатах-чытальнях на працягу года – па 2–3 работніка. Як адзначаецца ў архіўных дакументах, на працу ў культасветустановы іншы раз назначаліся выпадковыя асобы, якія нават не ведалі, у чым заключаюцца іх абавязкі [6, ф. 805, воп. 2, с. 17, арк. 140]. Праблема прыцягнення і падрыхтоўкі вопытных кваліфікаваных кадраў для культасветработы актуальнай заставалася даволі доўга.

Як адзначаюць справаздачы сельскіх культработнікаў, наведванні вяскоўцамі культурна-асветных ўстаноў былі нізкімі. Каб прыцягнуць вясковую моладзь да палітыка-масавай работы, лекцыі і даклады праводзілі перад танцамі і масавымі гульнямі [7]. Занятасць цэлы дзень на працы ў калгасе і ў дамашняй гаспадарцы перашкаджала вяскоўцам займацца іншымі справамі. Былі і іншыя прычыны ігнаравання культасветустаноў. Па ўспамінах Т.А. Захарчук, загадчыцы Паршавіцкай хаты-чытальні Пінскага раёна Пінскай вобласці, у 1945–1946 гг. «людзі абыходзілі сельсавет, таму што баяліся то

вывазу, то канфіскацыі, то яшчэ якога «хапуна», «толькі адзін стары калі-некалі заходзіў пачытаць газеты і ўсё сварыўся з загадчыцай і яе сяброўкамі, якія рэдка, але ж бавілі час у хаце-чытальні, асабліва, калі былі рэлігійныя святы і дома не было работы» [8]. У архіўных дакументах адзначаюцца і станоўчыя прыклады. Вельмі добрая праца хаты-чытальні ў в. Чарнаручча Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці тлумачылася інспектарам Віцебскага аблана наступным: па-першае, ініцыятыўнай, «жаждущей» усяго новага камсамолкай, па-другое, сельсавет па-гаспадарску адносіўся да яе пажаданняў, па-трэцяе, дзейнасцю моцнага актыву сельскай інтэлігенцыі [3, арк. 26].

У чэрвені 1946 г. Камітэт па справах культурна-асветных устаноў пры Савеце Міністраў РСФСР распрацаваў «Положение о государственном сельском клубе» пры сельскім савеце (яно распаўсюджвалася і на іншыя саюзныя рэспублікі), дзе быў пералічаны шэраг мерапрыемстваў на год, якія павінны былі праводзіць культасветработнікі: тлумачэнне палітычных з'яў і падзей, палітычная і навукова-практычная прапаганда, кансультацыі па пытаннях эканомікі, правядзенне выбараў у Вярхоўны Савет СССР і мясцовыя саветы, удзел у святах і інш. [9]. Таму адпаведна на першае месца ў дзейнасці культустаноў ставілася прапаганда палітычных і навуковых ведаў, у той час праблемам гуманітарнага і эстэтычнага выхавання сельскіх жыхароў увагі ўдзялялася недастаткова.

Прааналізаваўшы архіўныя дакументы, можна зрабіць выснову, што ў культасветустановах асноўная праца вялася ў зімовы перыяд, а ў час правядзення палявых і іншых работ агітацыйна-растлумачальная работа культасветустаноў пераносілася непасрэдна ў поле ці на ферму. Лепшых поспехаў у працы дабіваліся тыя культасветустановы, у якіх было шырокае кола актывістаў. Прывядзём такія прыклады. У 1947 г. загадчыкі Верабушскай хаты-чытальні гр. Чудакова, Кушлянскай – гр. Заянкоўская, Данюшэўскай – гр. Токман і актывісты Смаргонскага раёна Мінскай вобласці ў перыяд хлебанарыхтоўчай кампаніі арганізавалі чырвоныя абозы з хлебам па 100–150 падвод кожная. У хатах-чытальнях у гэты перыяд працавалі 190 сталоў даведак, якія далі сялянам тлумачэнні на 2173 пытанні, правялі 2748 гутарак з ахопам насельніцтва 12925 чалавек [7, ф. 4629, воп. 3, с. 42, арк. 49]. Але і на гэтым накірунку назіраліся «цікавыя» перагібы – ацэнка працы культасветустаноў часта вялася па прыкметах: справіўся калгас ці саўгас з нарыхтоўкай сельгаспрадуктаў ці не. Калі справіўся, значыць культасветустановы спрацавалі добра, і наадварот. Такія прыклады зафіксаваны вясной 1946 г. у Бешанковіцкім раёне Віцебскай вобласці, дзе адставанне раёна па выкананні плана вясенняй сяўбы (на 11 месцы ў вобласці) і па выкананні планаў малакапаставак (на 13 месцы) перад партыйным кіраўніцтвам было растлумачана недахопамі ў працы бібліятэк і хат-чытален [3, арк. 476].

Зазначым, што культурна-асветныя ўстановы ствараліся ў асноўным у цэнтрах сельсаветаў і калгасаў. Таму адным з накірункаў працы з'яўлялася стварэнне ў калгасах і саўгасах бібліятэк-перасовак. Напрыклад, у 1949 г. у сельскай мясцовасці Віцебскай вобласці працавалі 853 бібліятэкі-перасоўкі (16313 экзэмпляраў кніг), чытачамі з'яўляліся 13018 чалавек [3, с. 31, арк. 592]. Разам з тым, у пастаноўцы бібліятэчнай справы пасля вайны заставалася шмат нявырашаных праблем. Існуючая ў сельскай мясцовасці сетка бібліятэк была нешматлікай і нездавальняюча забяспечвалася новай літаратурай. У канцы 1950 г. толькі 9% калгасаў рэспублікі мелі свае бібліятэкі, нават у шэрагу саўгасаў і МТС іх не было. Як сведчаць архіўныя дакументы, нездавальняюча праводзілася работа па стварэнні і росце фондаў калгасных бібліятэк у Маладзечанскай, Магілёўскай, Гродзенскай, Віцебскай абласцях. Напрыклад, у Докшыцкім раёне Маладзечанскай вобласці ў 1954 г. не было ніводнай

бібліятэкі з кніжным фондам у 300 экзэмпляраў [10]. Пэўную дапамогу сельскім установам культуры аказвалі бібліятэкі абласных і раённых цэнтраў. У іх адрас высылаліся рэкамендаваныя спісы літаратуры для правядзення мерапрыемстваў па актуальнай тэматыцы, у бібліятэкі выязджалі спецыялісты, якія праводзілі гутаркі аб захаванні і ўліку кніжнага фонду, рабоце з кнігай, аказвалі метадычную дапамогу [3, арк. 88].

Трэба адзначыць, што пры адсутнасці тэлебачання ў сельскай мясцовасці амаль адзінымі крыніцамі навін і падзей у свеце з'яўляліся газеты і часопісы. Да прыкладу, у 1946 г. кожная вясковая бібліятэка (у сярэднім) павінна была выпісваць 18 назваў і 18 экзэмпляраў газет на суму 641 руб. 20 кап., 15 назваў і 15 экзэмпляраў часопісаў на суму 420 руб. 60 кап. [3, арк. 328]. Пры гэтым спецыяльных сродкаў на выпіску перыядычнай літаратуры для культасветустаноў дзяржавай не адпускалася, а падпіска праводзілася за лік сродкаў, адпушчаных на набыццё літаратуры, што адмоўным чынам сказвалася на камплектаванні бібліятэк новымі кнігамі. У пасляваенныя гады дастаўка перыядычных выданняў у аддаленыя вёскі была настолькі дрэннай, што газет не атрымоўвалі нават агітатары і сельская інтэлігенцыя. У выніку, адсутнасць друкаванага слова ў сваю чаргу адмоўна ўплывала на стан палітмасавай і агітацыйнай работы сельскіх культурна-асветных устаноў. Як прыклад, можна прывесці радкі адной са справаздач аб арганізацыі работы з настаўнікамі ў 1945–1946 гг. у Суражскім раёне Віцебскай вобласці: «с начала учебного года мы не прослушали ни одной лекции», «газеты выписали, а получаем их один раз в три недели. Художественной литературы не видим. Изба-читальня почти не работает, а пойти почти некуда...» [3, с. 351, арк. 20].

Рэалізацыі творчых здольнасцей і практычных уменняў сельскіх жыхароў у сярэдзіне 40-х – пачатку 50-х гг. садзейнічалі раённыя і абласныя агляды мастацкай самадзейнасці. У 1946 г. у рэспубліцы ў вясковых самадзейных гуртках займалася 35 тыс. чалавек, якія актыўна ўдзельнічалі ў аглядах мастацкай самадзейнасці [3, арк. 527]. Аднак, у шэрагу рэгіёнаў стан мастацкай самадзейнасці не адпавядаў прад'яўляемым патрабаванням – нізкім было выканаўчае майстэрства ўдзельнікаў, да ўдзелу ў гуртках рэдка прыцягваліся калгаснікі старэйшага ўзросту, харавыя калектывы часта не мелі мужчынскіх галасоў; не вызначаліся багаццем выступленні ў жанравых адносінах, частка гурткоў стваралася толькі ў час чарговых аглядаў і прыпыняла працу адразу пасля іх. Тым не менш, да канца чацвёртай пяцігодкі ў клубных установах Міністэрства культуры БССР налічвалася 2627 драматычных гурткоў (28,3 тыс. удзельнікаў), музычных – 511 (4,1 тыс. чалавек), харавых – 2202 (36 тыс.), харэаграфічных – 1228 (11,2 тыс.) [3, арк. 527]. У значнай ступені самадзейная мастацкая творчасць была адной з найбольш даступных і дзейсных форм далучэння сельскіх жыхароў да мастацтва, павышэння іх культурнага ўзроўню, пашырэння магчымасцей для рэалізацыі іх здольнасцей.

Трэба адзначыць вельмі складаны грамадска-палітычны стан у пасляваенныя гады ў заходніх абласцях БССР. Частка насельніцтва тут не падтрымлівала Савецкую ўладу. Вынікам гэтага былі не толькі антысавецкія выступленні сялян супраць новага ладу жыцця, але і даволі стрыманыя адносіны да пераўтварэнняў у вёсцы. Патрэбна адзначыць, што працаваць культустановам у заходніх абласцях было вельмі складана і па прычыне дзейнасці шматлікіх узброеных бандфарміраванняў. У выніку складваліся негатыўныя адносіны сельскага насельніцтва да дзяржаўных мерапрыемстваў, а значыць, і да культасветустаноў. Захавалася шмат дакументаў, якія сведчаць аб нападах «бандыцкіх» груповак на ўстановы культуры, знішчэнні кніг, культінвентару, падпале культасветустаноў і, нават, фізічных расправах. Напрыклад, 1 красавіка 1944 г. у Лаздунскім сельсавеце

Свірскага раёна Маладзечанскай вобласці «бандыты» (так у тэксце) напалі на сельсавет, дзе знаходзіліся настаўнікі, якія праводзілі работу па прыцягненні моладзі ў камсамол. Ад выбуху гранаты быў паранены загадчык хаты-чытальні, інспектар раённага аддзела народнай адукацыі быў забіты [7, ф. 4629, воп. 3, с. 3, арк. 73]; у 1944 г. у в. Дайнова Гераненскага сельсавета Іўеўскага раёна гэтай вобласці забілі актывіста па падпісцы на пазыку [7, ф. 4629, воп. 4, с. 42, арк. 66].

Такім чынам, першая пасляваенная дзесяцігодка з'явілася важным этапам у гісторыі культурнага развіцця беларускай вёскі і калгаснага сялянства. У пасляваенныя гады культурна-асветная дзейнасць органаў масавай інфармацыі, народнай адукацыі і культуры павінна была дапамагчы вырашыць у першую чаргу галоўную праблему – аднавіць народную гаспадарку БССР і сельскую гаспадарку ў прыватнасці. Будаўніцтва метадам народнай ініцыятывы і дзяржаўныя асігнаванні спрыялі ўзвядзенню ў многіх раёнах будынкаў для культустаноў, колькасць якіх з кожным годам павялічвалася.

Аб станоўчай дынаміцы змяненняў наглядна сведчыць прыведзеная табліца [10, с. 1, арк. 16; с. 10, арк. 91]:

Табліца

| Год | Колькасць хат-чытален | Колькасць сельскіх клубаў | Колькасць сельскіх дамоў культуры | Колькасць калгасных клубаў | Колькасць раённых дамоў культуры |
|---|---|---|---|---|---|
| 1946 | 2513 | – | – | 148 | 152 |
| 1947 | 2552 | 58 | – | 183 | 161 |
| 1948 | 2451 | 118 | 170 | 432 | 167 |
| 1949 | 2498 | 106 | 197 | 962 | 172 |
| 1950 | 2519 | 181 | 197 | 1113 | 175 |
| 1951 | 2437 | 273 | 200 | 1174 | 175 |
| 1952 | 2231 | 482 | 224 | 1202 | 175 |
| 1953 | 2107 | 637 | 224 | 1266 | 175 |
| 1954 | 2943 | | 224 | 1202 | 175 |

Поспехі былі б яшчэ больш уражлівымі, калі б адносіны мясцовага кіраўніцтва да дзейнасці культасветустаноў былі больш уважлівымі і канкрэтнымі. Развіццё культурна-масавай работы стрымлівалі дрэннае фінансаванне культасветустаноў, вельмі нізкі кваліфікацыйны ўзровень кадраў культработнікаў, частая іх змена, амаль поўная адсутнасць грамадскіх пачаткаў у дзейнасці ўстаноў культуры. Рэшткавы прынцып фінансавання культурна-асветных устаноў прыводзіў да таго, што ў беларускай вёсцы на працягу першага пасляваеннага дзесяцігоддзя не хапала самага неабходнага для развіцця культурнага ўзроўню сельскага насельніцтва – кніг, газет, часопісаў, радыёпрыёмнікаў, кінаапаратуры і інш. Тым не менш, працэсы аднаўлення культасветустаноў і ўдасканалення іх працы насілі адназначна скіраваны характар – завяршыць аднаўленне культурнай структуры пасляваеннай вёскі якасна і ў самы кароткі тэрмін.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Энцыклапедыя гісторыі Беларусі***: у 6 т. – Т. 2. Беліцк-Гімн / Рэдкал.: ***Б.І. Сачанка*** (гал. рэд.) і інш. – Мн., 1994. – 537 с., арк. 434.
2. ***Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці*** (ДАБВ). Ф. 1, воп. 2, с. 196, арк. 2.
3. ***Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці*** (ДАВВ). Ф. 2806, воп. 1, с. 8, арк. 349.

4. ***Котаў А.І.*** Асаблівасці аднаўлення і развіцця культурна-асветных установ у пасляваеннай беларускай вёсцы (1945–1950 гг.) // Пытанні культуры і мастацтва Беларусі. Вып. 12. – Мн., 1999. – 168 с., арк. 118.
5. ***Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці*** (ДАГВ). Ф. 3329, воп. 1, с. 2, арк. 654.
6. ***Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці*** (ДАМгВ). Ф. 2312, воп. 1, с. 11, арк 75.
7. ***Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці*** (ДАМВ). Ф. 2397, воп. 1, с. 6, арк. 12.
8. ***Бяспалая М.А.*** «...а ногі ставяць на сядзенні» // Беларуская мінуўшчына, 1997, № 4. – С. 75.
9. ***Положение о государственном сельском клубе*** // Культурно-просветительная работа, 1946, № 3–4. – С. 50–61, арк. 3.
10. ***Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь*** (НАРБ). Ф. 974, воп. 2, с. 1, арк. 74.

*SUMMARY*

*The cultural and educational work in Belarusian village in the first post-war decade is analysed in the article.*

*Поступила в редакцию 24.11.2005*